(https://palesse.press/)

Шукаць

(https://www.facebook

Раёны (https://palesse.press/category.php?slug=areas)

Правы чалавека (https://palesse.press/category.php?slug=hr)

Грамадства (https://palesse.press/category.php?slug=society)

Экалогія (https://palesse.press/category.php?slug=ecology)

Палітыка (https://palesse.press/category.php?slug=policy)

Эканоміка (https://palesse.press/category.php?slug=economy)

Культура (https://palesse.press/category.php?slug=culture)

Спорт (https://palesse.press/category.php?slug=sport)

Беларусь (https://palesse.press/category.php?slug=belarus)

Свет (https://palesse.press/category.php?slug=world)

Суды за тое, што «подошли и просто стояли». Жыхароў Калінкавічаў судзяць за 27 лютага

Палеская Вясна 02.04.2022

>>>>

Да масавай карнай акцыі прыцягнутыя карныя органы Мазырскага і Калінкавіцкага раёнаў.

27 лютага некалькі жыхароў і жыхарак Калінкавічаў прыехалі ў Мазыр, каб пашпацыраваць у цэнтры горада. Але там іх затрымалі. Начальнік Аддзелу аховы парадку і прафілактыкі Мазырскага РАУС **Аляксандр Пашэвіч** напісаў данос на каленкаўцаў свайму начальніку. Тое, што і як Пашэвіч інтэрпрэтаваў як правапарушэнне, цяжка зразумець з гледзішча здаровай логікі. Але служкі Лукашэнкі гатовыя на ўсё, каб атрымаць зорку на пагон і ласку сваіх патронаў.

Аляксандр ПАШЭВІЧ.

Дарэчы, гэты самы Пашэвіч ўвосень 2020 года ўзяў на сябе адказнасць (https://palesse.press/news.php?slug=4071) за нахабны разгон мірнага шэсця праз правакацыі, калі людзей пачалі хапаць проста на ходніках, а таксама затрымалі праваабронцу **Уладзіміра Целепуна**, які ўвогуле ў шэсці не ўдзельнічаў, а проста вёў назіранне і маніторынг таго, што адбываецца. Тады

Пашэвіч яшчэ быў маёрам і часовым выканаўцам начальніка аддзела АПП. За старанное выслужванне перад уладай яму кінулі зорку на пагоны і зацвердзілі на пасадзе. Цяпер ён падпалкоўнік і начальнік ААПП.

Але, тое, як ён у сваім даносе апісвае нібыта выкрытае ім правапарушэнне, варта цытыты:

> “*В ходе несения службы, примерно в 17.20 на площади Ленина г. Мозыря было замечено* ***массовое*** *скопление граждан, а именно* ***3 женщины и 3 мужчины****, которые в присутствии иных проходящих граждан, длительное время находились на одном месте без движения, чем* ***публично демонстрировали свое массовое скопление****, в последствии при приближении сотрудников ОВД, для предупреждения проведения ими массового мероприятия (Пикетирование), приняли меры к передвижению в иное место, при этом воспользовавшись разными путями передвижения, в частности к по ул. Советской, 35, где вновь собрались вместе и* ***продолжили свое публичное нахождение*** *без движения на одном месте, в связи с чем данная группа граждан были задержаны сотрудниками*».

/Лукашэнкавыя прыспешнікі падчас ажыццяўлення рэпрэсіяў ад імя дзяржапарату, якім кіруе Лукашэнка, выкарыстоўваюць выключна расійскую мову, таму для цытавання іхніх выказванняў ў нашых матэрыялах захоўваецца гэтая мова/

Данос, складзены Пашэвічам.

У цалкам аднолькавых справах аб адміністрацыйных правапарушэннях складзеных на шасцярых каленкаўцаў, маецца яшчэ пратакол апытання сведкі. Сведкам выступіў іншы прыспешнік лукашэнкавага рэжыму – нейкі супрацоўнік Мазырскага РАУС **Яўген Місько**. Ён таксама апісвае злачынныя дзеянні «групы грамадзян» і сваё гераічнае змаганне з «неправомерными действиями» ва ўласцівых лукашыстам катэгорыях:

«Около 17.20 мною было обращено внимание на несколько групп граждан не более 5 человек в каждой, которые находились продолжительное время на площади. Около 17.30 две группы граждан подошли друг к другу на площади Ленина г. Мозыря, вблизи городского дома культуры. ***Они подошли друг к другу и просто стояли****. С целью* ***пресечения неправомерных действий*** *со стороны данных лиц, мною было сообщено пешему наряду о происходящем, также я доложил о происходящем руководству*».

Аповяд Яўгена Міська.

І вось такія вось аповяды пра нібыта праварушэнні сталі падставай для таго, каб людзей прызналі вінаватымі і прысудзілі значныя штрафы. Адным з доказаў віны карнікі лічаць скрын-шот абмеркавання ў чаце «Мозырь 97%» у мэсэджары Тэлеграм, дзе нехта пытаецца ва ўдзельнікаў ці пойдзе хто-небудзь на плошчу а 17-й гадзіне. Але ні ў каго з затрыманых каленкаўцаў у тэлефонах не знайшлі нет толькі чата «Мозырь 97%», але і самога мэсэджэра Тэлеграм.

Зараз вядома пра трох жыхароў і жыхарак Каленкавічаў, якім вынеслі прысуды паводле такіх сфабрыкаваных справаў. Прычым, работнікі суда ў Мазыры не даюць рады самастойна ўсіх пазасуджваць і да справы прыцягнулі іхніх калег з калінкавіцкага суда.

Прызначаная Лукашэнкам на пасаду суддзі ў суд Мазырскага раёна Марыя Буглак адну з жанчын прызнала вінаватай і прысудзіла 70 базавых вялічыняў **штрафу** (**2 240 рублёў**).

Іншая, таксама прызначаная самім Лукашэнкам разбірацца ў палітычнай справе, але ўжо на пасаду суддзі ў суд Калінкавіцкага раёна – **Святлана Кугейка** палічыла, што гэтыя абсурдныя абвінавачванні цалкам у межах лукашысцкага заканадаўства і простае стаянне на плошчы ўтварае склад правапарушэння, у якім яна прызнала вінаватай іншую жыхарку Калінкавічаў і пакрала **штрафам**, памерам 15 базавых (**480 рублёў**).

Галіна ЗАГВОЗДЗІНА.

А такая ж самая прызначаная Лукашэнкам на пасаду суддзі **Галіна Загвоздзіна** палічыла вінаватым аднаго з мужчын, пакараўшы штрафам на 25 базавых вялічыняў (**800 рублёў**). Пры гэтым ніхто з асуджаных не прызнаў сябе вінаватым у тым, што здзейсніў нешта супрацьпраўнае.

29.4k
Shares

0 Comments

Login

Start the discussion...

LOG IN WITH

OR SIGN UP WITH DISQUS

Name

Share

Best Newest Oldest

Be the first to comment.

Subscribe Privacy Do Not Sell My Data

DISQUS



(http://spring96.org/be)

ПАПУЛЯРНЫЯ НАВІНЫ

У Рэчыцы карнікі арыштавалі вядомага мастака-шаржыста Анатоля Шчогалева (https://palesse.press/news.php?slug=4085)

Вітаўт ІЛЛІН 18.04.2023

Жыхара Рэчыцы прымусілі выбачацца на камеру карнікаў (https://palesse.press/news.php?slug=1144)

Вітаўт Іллін 04.04.2023

Карнікі затрымалі рамесніцу ў Рэчыцы (https://palesse.press/news.php?slug=1143)

Вітаўт Іллін 28.03.2023

У красавіку – дні народзінаў у двух палітзняволеных з Мазыра (https://palesse.press/news.php?slug=5409)

Цімур Казачэнка 11.04.2023

У спісе палітзняволеных – яшчэ адзін чалавек з Мазыра (https://palesse.press/news.php?slug=6998)

Цімур Казачэнка 11.04.2023

У Рэчыцы ўлады арганізавалі выкарыстнне прымусовай неаплатнай працы жыхароў раёну (https://palesse.press/news.php?slug=2037)

Вітаўт Іллін 11.04.2023

У калонію каля Мазыра пераведзены палітзняволены Сяргей Ярашэвіч (https://palesse.press/news.php?slug=4084)

Цімур Казачэнка 06.04.2023

У Каленкавічах лукашэнкаўцы на расійскі капыл стварылі «юнармію» (https://palesse.press/news.php?slug=2038)

Вітаўт Іллін 22.04.2023

Яна не падпарадкоўваецца адміністрацыі. Палітзняволеную ў рэчыцкай калоніі судзяць трэці раз (https://palesse.press/news.php?slug=0877-1)

Цімур Казачэнка 07.04.2023

За сакавік стала больш на аднаго палітзняволенага з Мазыра (https://palesse.press/news.php?slug=7093)

Цімур Казачэнка 31.03.2023

ЗВЯЗАЦЦА З НАМІ

contact@palesse.press

Перадрук і цытаванне матэрыялаў парталу дазваляецца з абавязковай актыўнай індэксуемай гіперспасылкай на сайт palesse.press не ніжэй за другі абзац.